УДК 885.0(09)

*Т.І. Борбат, М.І. Чмарава*

# МАРА І ДЗЕЯННЕ Ў ТВОРЧАСЦІ КАРЭЛА МАХІ І ЁЗАФА ФРЫЧА (дзве ўзаемадапаўняльныя праявы чэшскага байранізму)

*В статье анализируются специфические проявления чешского байронизма в творчестве Карела Махи и Иосифа Фрича, акцентируется внимание на общих и отличительных чертах их поэзии и мировосприятия, которые являются взаимодополняющими в чешской романтической литературе.*

*This article analyzes the specific manifestations of the Czech Byronism in the works of K. Maha and J. Fritsch, focuses on the common and distinctive features of their poetry and worldview that are complementary in the Czech romantic literature*

Творчасць Ёзафа Вацлава Фрыча (1829–1890) з храналагічнага пункту гледжання выходзіць далёка за межы Махавага перыяду, але генетычна яна непарыўна звязана з наймалодшай (махаўскай) генерацыяй нацыянальнага адраджэння. Пасля сваёй смерці Карэл Гінэк Маха (1810–1836) стаў своеасаблівым сімвалам новых мастацкіх і эстэтычных ідэй у чэшскай літаратуры. Пасля выхаду ў свет яго паэмы “Май” стала відавочным, што старыя класіцыстычныя і псеўдапатрыятычныя ідэі ўжо не адпавядаюць новаму часу. Новае пакаленне чэшскіх літаратараў (К. Сабіна, Б. Немцава і інш.) сталі актыўна развіваць і папулярызаваць творчыя дасягненні К. Махі. Жыццё Ё. Фрыча было нібы працягам Махавага. Яны дапаўнялі адзін аднаго. Параўноўваючы Маху і Фрыча, Я. Врхліцкі адзначаў, што “Маха сваё жыццё больш мроіў, а Фрыч больш жыў” [2, с. 288]. Жыццё Фрыча было больш на-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

сычаным, як знешнімі, так і ўнутранымі падзеямі. На працягу свайго жыцця ён быў і паэтам, і журналістам, і драматургам, і палітыкам. Прымаў актыўны ўдзел у рэвалюцыі 1848 года – быў кіраўніком штаба няўдалага пражскага паўстання. Ад смяротнага пакарання яго выратаваў Ф. Чалакоўскі, які быў блізкім родзічам Ё. Фрычу, хоць ідэалагічна яны разыходзіліся кардынальна – Чалакоўскі ненавідзеў Байрана і ўсё, што з ім было звязана. Ё. Фрыч жа пісаў: "Байран – паэт, арыстакрат par excellence, і яго героі сталі для мяне ідэаламі" [1, с. 199]. Спосаб жыцця неўтаймаванага Байрана стаў пэўным прыкладам для Фрыча. Але, у адрозненні ад Махі, Фрыч быў чалавекам дзеяння. Знешнія праявы жыцця былі для яго спосабам сцвярджэння сваіх духоўных ідэалаў. Для Махі акаляючая яго рэчаіснасць была горкім расчараваннем. Яна не прыносіла яму вялікай радасці праз дысгармонію з яго ўнутраным светам. Маха не змог, у адрозненні ад Фрыча, знайсці ўласнага месца ў жыцці. Таму вытокі асабістай і паэтычнай індывідуальнасці Фрыча трэба шукаць у паэзіі Махі, у яго стылёвым і духоўным бунце супраць закасцянеласці чэшскай літаратуры і грамадства. Яны абодва былі перакананы ў тым, што чэхам патрэбна сучасная, свабодная, дэмакратычная, раўнапраўная літаратура, якая б паяднала нацыянальную і славянскую ідэю з ідэямі еўрапейскімі, з ідэяй свабоды думкі і навізны пры выбары тэматыкі. Розніца заключалася ў тым, якім спосабам магчыма дасягненне такога ідэалу. У псіхалагічным аспекце жыцця і творчасці і Маха, і Фрыч былі рамантыкамі, але, калі ў Махі пераважаў інтраверсійны пачатак з меланхалічным адценнем, то ў Фрыча пануючым быў экстраверсійны пачатак з яскравым сангвіністычным адценнем. У гэтым трэба шукаць першавытокі іх жыццёвай пазіцыі. Уласцівы для Махі песімізм і адсутнасць веры не мелі значэння для Фрыча ў выражэнні ўласных думак і пачуццяў, бо песімізм Махі прымушаў задумацца пра быццё і яго сэнс. Песімізм і скептыцызм Махі не быў беспадстаўны, як гэта намагаліся давесці прадстаўнікі чэшскай фальклорна-патрыятычнай школы (Тыл, Томічак, Чалакоўскі і інш.). Фрыч у сваёй творчасці намагаўся пераасэнсаваць сімвалы паэзіі Махі згодна з уласным разуменнем покліча чалавека да сэнсу жыцця. Ужо ў 1840-х і 1850-х гадах XIX стагоддзя паэзія Махі, яго спосаб мыслення ўвасаблялі ў сабе для маладога пакалення міфатворцаў новыя каштоўнасці, новы тып творчага чалавека, свабоднага ад стэрэатыпаў і шаблонаў, характэрнага для старэйшага пакалення. Таму, магчыма, Фрыч, наследаваў Маху не столькі ў паэтычным стылі, колькі ў агульным духу адвагі і смеласці, з якою Маха кінуў выклік "традыцыяналістам". Патрыярхальны характар чэшскай літаратуры выклікаў негатыўную рэакцыю як у Махі, так і ў Фрыча. Асабліва гэта абвастрылася ў Фрыча пасля 1848 года. За сваю рэвалюцыйную дзейнасць ён быў асуджаны да 18 гадоў зняволення.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Пасля амністыі 1854 года Фрыч распачаў выдаваць альманах "Lada niola", якія стаў трыбунай для выражэння палемічных думак прадстаўнікоў новай чэшскай літаратурнай генерацыі. Мастацкім дэвізам альманаха стаў выраз "Мара, якая падштурхоўвае да дзеяння". Фрыч засведчыў сябе як эстэтычны і ідэалагічны наступнік Махі. Яны дапаўнялі адзін аднога ў кантэксце рамантычнага светаадчування. Маха і Фрыч, імкнучыся параўняцца з Байранам, пайшлі ўзаемадапаўняльнымі шляхамі. Невядома, як бы склаўся творчы лёс Махі, калі б ён пражыў даўжэй. Сучасны ўкраінскі даследчык творчасці К.Г. Махі І. Мельнічэнка адзначае: "У стылі і паэтычнай манеры блізкай да Байрана, ёсць і паэзія Махі (скепсіс, песімізм, дэманстратыўнае ахвяраванне жыццём і інш.), за спосабам укаранення сваіх ідэй у жыццё (манера паводзінаў, ігнараванне небяспекі, бурлівае свецкае жыццё інш.) да Байрана ён быў бліжэй, чым Фрыч" [1, с. 81–82]. Часам і ў Фрыча з'яўляюцца думкі пра ціхае і спакойнае жыццё і такую ж самую смерць. Падобныя настроі маглі быць толькі тагачаснай выявай эмоцый. Фрыч вельмі любіў жыццё і верыў у яго, каб так лёгка ізалявацца ад усіх яго праяў. Да таго ж Фрыч быў вельмі радыкальным палітыкам, які верыў у магчымасць хуткіх змен і актыўна змагаўся за іх. А такая жыццёвая пазіцыя вымагае пэўнай канцэнтрацыі ўсіх жыццёвых сіл, актыўнай, дынамічнай дзейнасці, сілы духу і зусім не спрыяе самазаглыбленню.

Калі Маха толькі ставіў пытанні аб недасканаласці свету, то Фрыч намагаўся хоць неяк яго змяніць. Але па сваёй унутранай сутнасці і Маха, і Фрыч былі летуценнікамі, якія востра адчувалі сусветны боль. Яны абодва жылі ў сваім ідэальным свеце, які вельмі кантраставаў са светам рэальным, адносна якога абодва паэта не мелі ніякіх ілюзій. Яны намагаліся шукаць ідэал у жаночых вобразах. Як імпульсіўныя асобы, яны кахалі горача, непаўторна і дужа балюча ўспрымалі свае інтымныя няўдачы. Асабліва багата іх меў у свае маладыя гады Фрыч. Але ж каханне ніколі не натхняла яго, а інтымная лірыка не была яго стыхіяй. Узорам для творчасці быў Байран, а не Гейнэ. Для Махі каханне было як крыніцай натхнення, так і расчаравання. Ён быў чалавекам нетрывалым, настрой у яго змяняўся раптоўна, і людзям было няпроста падтрымліваць з ім стасункі, нягледзячы на тое, што сам паэт быў натурай добрай і шчырай. Першым яго каханнем была Марынка Сціхава – дачка ляснічага. Ужо тады праявіліся асноўная рыса яго творчага характару ў стаўленні да жонкі. Маха шукаў ідэальнае ў рэальным жыцці. Другім (і галоўным для Махі) каханнем была Лора Шомкава. Яна была вельмі прывабнай, але недасведчанай дзяўчынай, без асаблівых глыбокіх перажыванняў. Такім чынам, асноўная суперэчнасць Махі паміж ідэальным і рэальным, суб'ектыўным і аб'ектыўным знайшло сваё адлюстраванне ў каханні да Лоры.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Сама ж Лора стала галоўным імпульсам і эмацыйным стрыжнем для напісання "Мая" і "Цыганаў".

Фрыч у сваёй творчасці дакладна размяжоўваў ідэальнае і рэальнае. Суб'ектыўныя пачуцці ў творчасці Фрыча не займаюць такога месца, як у Махі. Ён прагнуў рэалізацыі ідэалаў яшчэ ў рэальным жыцці. Для Махі гэта мяжа была неакрэсленай, і ён падсвядома ўвесь час яднаў рэальныя і ідэальныя вобразы. У гэтым і трэба шукаць вытокі непаўторнага каларыту яго паэзіі.

І на Фрыча, і на Маху вялізны ўплыў меў польскі вызваленчы рух і польская паэзія. Але, у адрозненні ад Фрыча, Маха не браў удзел у польскім вызваленчым руху. Яго больш вабіла польская рамантычная паэзія. Абставіны асабістага жыцця (цяжарнасць Лоры, цкаванне пасля выхаду паэмы "Май") маральна аслаблялі Маху, вымушалі шукаць пэўнага спакою і стабільнасці. Пасля нараджэння сына Людвіга гэтыя намаганні ўзмацняюцца. На змену яскрава выражаным байранічным настроям прыходзіць глухая псіхалагічная апазіцыя існуючаму стану рэчаў. У лістах да сяброў у розных кантэкстах сустракаецца імя Мефістофеля з "Фауста" Гётэ. Маха часта і беспадстаўна раўнуе Лору. Уся яго энергія канцэнтруецца на ўладкаванні сямейнага жыцця. Унутрана Маха ўжо быў надламаны. І калі Фрыч больш за дваццаць год прабыў у выгнанні за мяжой, то Маха знаходзіўся ў выгнанні духоўным, псіхалагічным.

Фрыч пасля дваццаці год эміграцыі таксама быў вымушаны змірыцца з рэаліямі жыцця. Пад ціскам знешніх абставінаў Фрыч быў вымушаны прыняць прысягу на вернасць імператару Францу Іосіфу І. Ён пайшоў на гэты акт самапрыніжэння, каб вярнуцца да сям'і. Але пасля свайго вяртання ў 1887 годзе ў Прагу Фрыч зразумеў, што часы змяніліся, і ён ужо не быў кумірам для маладых творцаў. Па сутнасці, Айчына стала для яго чужынаю. Ён імкнуўся займацца публіцыстыкай, выдавецкай справай. Потым яго запрасілі для ўдзелу ў выбарах младачэхі, якія ў сваёй агітацыі за кандыдатуру Фрыча выкарыстоўвалі яго бурнае палітычнае мінулае. Але Фрыч прайграў з-за няздольнасці прыстасоўвацца да новых палітычных умоў. Яго ахапіла безнадзея. На палітычную арэну выходзілі прагматыкі на чале з Т.Г. Масарыкам. Рамантызм ужо не ўпісваўся ў новую сістэму сацыяльных каардынат. У выніку Фрыч, як і Маха, перад смерцю застаўся адзінокім. Абодвух паэтаў да канца жыцця так ніхто і не зразумеў.

## Літаратура


1. *Мельниченко, І.В.* "Далека путь моя, та марний поклик…": творчість Карла Гінека Махі в контексті чеського і эвропейского романтизму 20–40-х рр. XIX ст. / І.В. Мельниченко. – Кіїв: Стилос, 2003. – 206 с.
2. *Žáček, V.* Josef Václav Frič / V. Žáček. – Praha: Melantrich, 1979. – 391 s.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова